**Максімчык Андрэй Мікалаевіч**

*Беларускі дзяржаўны універсітэт (Мінск, Беларусь)*

# ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ АКТЫЎНАСЦЬ БЕЛАРУСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА НА КАЎКАЗЕ Ў 1917—1918 ГГ.

У сучаснай айчыннай гістарыяграфіі пастаноўка пытанняў, звязаных з разглядам прысутнасці беларускага насельніцтва на Каўказе ў мінулым (Калі? Дзе? З якой прычыны? Колькі?) практычна не ставілася*. Як правіла, Каўказскі рэгіён у працах даследчыкаў згадваецца ў тых выпадках, калі гаворка ідзе пра высылку удзельнікаў паўстанняў XIX ст. (В. В. Гарбачова) або перасяленні асобных катэгорый насельніцтва ў 1830—1860-я гг. (В. С. Макарэвіч), аграрнае перасяленне сялян у другой палове XIX — пачатку XX ст. (В. П. Панюціч, П. Д. Верашчагін, П. С. Кручек, У. М. Сяргееў, А. В. Мацьвееў) ці практыкаваўшыяся перасяленні сялян у 1920—1930-я гг. (У. Я. Казлякоў, М. А. Бяспалая, В. М. Ракачаў). На сённяшні дзень адсутнічаюць працы, у якіх бы разглядаліся пытанні колькасці, палажэння і рээвакуацыі бежанцаў з беларускіх губерняў, якія падчас Першай сусветнай вайны і наступных ваенна-палітычных падзей першай чвэрці XX ст. апынуліся на Каўказе. Аналагічна выглядае ў гістарыяграфіі распрацоўка сюжэтаў, звязаных з грамадска-палітычнай актыўнасцю беларускага насельніцтва за межамі сваёй этнічнай тэрыторыі, а менавіта ў Каўказскім рэгіёне. На падставе апублікаваных крыніц, а таксама напрацовак сучаснікаў, разглядаемага ў артыкуле прамежку часу, можна пазначыць наступную сітуацыю па гэтым пытанні:

1) у 1917 г. на Каўказскім фронце пры садзейнічанні паручніка Язэпа Тroські (1893–?) (сапр. Язэп Касьянавіч Дудзюк) быў арганізаваны гуртток беларусаў-вайскоўцаў. Упершыню гэтае прозвішча і падзею ўзгадаў у адным са сваіх артыкулаў беларускі палытычны і грамадскі дзеяч К. Б. Езавітаў (1893—1946) [9, с. 2], дзякуючы якому імя Я. Троські ў далейшым было замацавана на старонках прац шэрага даследчыкаў [29, с. 150; 31, с. 64]. Дакументаў, распавядаючых аб накірунках дзейнасці гуртка, часе існавання, а таксама колькасці яго членаў да сённяшняга часу на жаль не знойдзена ці яны ўвогуле не захаваліся. Аб выніках дзейнасці гуртка можна ўскосна судзіць, саслаўшыся на выснову М. Краўцова (1891—1939) (сапр. Макар Мацьвеевіч Касьцевіч) аб беларускім нацыянальным руху ў асяроддзі вайскоўцаў (арфаграфія і пунктуацыя тэксту захаваны — *аўт.*): «на усіх тагочасных расейскіх фронтах, апрача Каўкаскага, былі беларускія арганізацыі, якія давялі справу ў канцы 1917 году да франтавых

* У якасці выключэння можна пазначыць шэраг даследванняў агляднага характара: *Хадубскі, А.* Цывілізацыйная роля беларусаў на Каўказе ў XIX — першай палове XX ст. // Беларусь паміж Усходам і Захадам: Праблемы міжнацыянальнага, міжрэлігійнага і міжкультурнага ўзаемадзеяння, дыялогу і сінтэзу / Рэд. Ул. Конан [і інш.]. — Мінск, 1997. — С. 52—57; *Черницын, С. В.* Белорусы // Энциклопедия культур народов Юга России: В 9 т. — Ростов н/Д. 2005. Т. 1. — С. 73—74; *Матвеев, О. В.* Белорусы на Кубани и в Черноморье в конце XVIII — первой половине XIX в. // Труды БГТУ. Сер., История, философия, филология. 2014. — № 5. — С. 19—21; *Кручек, П. С.* Белорусы на Кубани во второй половине XIX — начале XX века // Менталитет славян и интеграционные процессы: история, современность, перспективы: мат-лы X Междунар. науч. конф., Гомель, 25—26 мая 2017 г. / Под общ. ред. В. В. Кириенко. — Гомель, 2017. — С. 89—91.

беларускіх з'ездаў» [26, с. 4]. Адзначым, што ў асабістай стправе Я. Троські [32], а таксама прысвечаным яму артыкуле ў «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» аб гэтай дейнасці нічога не згадваецца [4].

2) летам 1918 г. у Стаўрапалі было адчынена консульскае прадстаўніцтва Беларускай Народнай Рэспублікі. Аб гэтай падзеі сцісла паведамлялася ў працы міністра беларускіх спраў ва Урадзе Літоўскай Рэспублікі Я. Варонкі «Беларускі рух ад 1917 да 1920 году» [2, с. 13]. Аднак аб яго дзейнасці нічога невядома, паколькі да сёняшняга часу архіў консульства не знойдзены [1, кн. 1, с. XVII]. Можна толькі дадаць, што сам Я. Варонка (1891—1952) мог мець пэўныя кантакты з існаваўшымі на той час беларускімі арганізацыямі на Каўказе, паколькі згодна Пастановы Народнага сакратарыяту БНР ад 23 жніўня 1918 г. ён быў камандзіраваны як надзвычайны пасланік у Літву, Украіну, Малдавію, Грузію і іншыя паўднёвыя рэспублікі [1, кн. 1, с. 216].

3) Патэнцыйна кантакт з беларускімі арганізацыямі на Каўказе мог падтрымліваць і А. І. Валькові́ч (1892—1937), які пэўны час з'яўляўся прадстаўніком БНР пры ўрадзе Грузінскай Дэмакратычнай Рэспублікі [30]. У лісце Народнага сакратарыяту БНР да старшыні Беларускай гандлёвай палаты М. В. Доўнар-Запольскаму (1867—1934) і консулу БНР ва Украіне П. В. Трэмповічу (1888—1956) ад 8 жніўня 1918 г. паведамлялася, што сакратарыят 6 жніўня таго ж года пастанавіў прызначыць Аляксандра Іванавіча асобаўпаўнаважанным па бежанскіх справах на Паўночным Каўказе з правамі консула [1, кн. 1, с. 232; 33, арк. 83]. Больш дакладна аб гэтай дзейнасці, як і аб інфармацыі, змешчаннай у асабістай анкеце А. Вальковіча, дзе ён адзначаў, што з'яўляўся Сабрам і намеснікам старшыні Беларускага камітэту на Каўказе (?), невядома [1, кн. 2, с. 1087]. Можна выказаць згадку, што падтрымліць сувязі з беларускімі грамадскімі аб'яднаннямі ў Грузіі мог таксама І. І. Краскоўскі (1880—1955), які ўзначальваў Украінскую надзвычайную дыпламатычную місію ў Грузінскай Дэмакратычнай Рэспубліцы [1, кн. 1, с. 371; 23]. Так, у адным з лістоў А. І. Цвікевіча (1888—1937) да кіраўніка Украінскай дыпламатычнай місіі на Каўказе І. Краскоўскага ад 5 верасня 1920 г., разважаючы над перспектывамі беларуска-украінскіх адносін, ён пісаў наступнае: «Калі будзе час — дайця хоць караценькую вестку аб сабе. Меня надта цікавіць наагуль становішча Грузіі, гэтым пачалі цікавіцца асабліва ўсе сацыялістычныя партыі Эўропы, пасьля таго, як пазнаёміліся з «камуністычным раем» Совдепа. Пачалі ехаць у «проста дэмакратычную Грузію». Калі ласка, напішыце таксама пару слов і аб тым ці чуваць што небудзь на Каўказе пра Беларусь і чы варушацца там нашые землякі? Бувайце здаровы! Жму руку!» [10]. Пэўныя спадзяванні знайсці цікавыя звесткі пра каўказскі перыяд дзейнасці І. І. Краскоўскага былі на яго асабісты фонд, які захоўваецца ў аддзеле рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа НАН Беларусі (Фонд 16), а таксама на мемуары яго дачкі Людмілы, дзе асобным разделам («Подорож на Кавказ і Грузія») яна распавядала пра час знаходжання Краскоўскіх у Грузіі [25, с. 53—64], але яны несправўдзіліся.

4) Малавядомай старонкай грамадска-палітычнага жыцця беларускага насельніцтва ў Грузіі з'яўляецца дзейнасць у Тыфлісе Каўказскай краёвай Беларускай Рады (ККБР), ці як яна яшчэ пазначалася ў крыніцах — Беларускай Рады [43]. Першая згадка пра гэту арганізацыю была змешчана ў справаз-

дачы аб дзейнасці Закаўказскага Рускага нацыянальнага камітэта за 1918 г. У ёй падкрэслівалася, што да лістападу 1917 г. у Тыфлісе функцыянаваў цэлы шэраг нацыянальных арганізацый: Армянскі, Грузінскі, Асецінскі, Мусульманскі нацыянальныя саветы, Украінская Рада, Латышская і Асірыйская нацыянальныя арганізацыі, а таксама Беларуская Рада [35, с. 1]. За выключэннем інфармацыі аб тым, што ўсе гэтыя арганізацыі былі «афіцыйна прызнаны Закаўказскім камісарыятам, адкрыта і афіцыйна выступалі ў абарону інтарэсаў прадстаўляемых імі нацыянальнасцяў» [35, с. 1], Беларуская Рада на старонках справаздачы больш не ўзгадвалася. У адным з нумароў віленскай газеты «Незалежная Беларусь» (рэдактар К. Мядзёлка) таксама адзначалася, што грамадскія арганізацыі беларусаў ёсць у Тыфлісе, Сімферопале, Севастопале і Стаўрапалі, «але аб іх дзейнасьці маецца мала вестак» [6, с. 4]. Аб Беларускай Радзе ўзгадвалася таксама ў даследаванні Ю. Васілеўскага і А. Сёмухі «Літаратурны акалот: Антон Беларусаў-Скалка» [3, с. 151], у якім аўтары выказалі згадку, што тыфліская Рада магла прафінансаваць выданне кнігі А. М. Супраўшчанскага Курылы «Очэрк і дума аб Беларусі» (Тыфліс: Выданьне друкарні Закаўказскіх чыгунак, 1918. 43 с.). Бібліяграфічныя звесткі пра гэта выданне былі змешчаны ў першым томе зборніка «Магілёўшчына» [27, с. 164]. Негледзячы на то, што выданне было надрукавана вялікім тыражом (3000 адзінак) выявіць яго асобнік у бібліятэках пакуль не атрымалася.

Часткова прабелы ў даследаванні гэтай арганізацыі дазваляе кампенсаваць тагачасны мясцовы (тыфліскі) перыядычны друк. Так, у газеце «Кавказское слово» ад 6 студзеня 1918 г. была змешчана аб'ява аб правядзенні Радай агульнага сходу ў будынку вучылішча па адрасе: вул. Мікалаеўская, д. 105. (сучасная назва — вул. І. Джавахішвілі). Тэкст аб'явы заканчваўся чатырохрадкоўем, сугучным з вершам Янкі Купалы «Свайму народу» (1918 г.):

*«Гей! Проснися беларусе:*
*Усе людцы паустали.*
*Гей! Праснися беларусе, —*
*Усе праудачку пазнали!»* [13, с. 1].

Такія кароткія аб'явы (аб правядзенні агульных сходаў) публікаваліся ў «Кавказском слове» на працягу ўсяго 1918 года [15; 16; 17; 21]. Цікава то, што акрамя Беларускай Рады, у газеце можна сустрэць і іншыя беларускія арганізацыі, утвораныя прыблізна ў гэты ж час у Тыфлісе. Так, у 25-ым нумары ад 1 лютага 1918 г. быў размешчаны нататак пад назвай «Белорусская громада». У ім чытачэй інфармавалі, што «в Тифлисе образовался гурток белоруссов, который между прочим ставит целью объединение белоруссов, защиту их национальных, правовых и экономических интересов, для чего открыто при гуртке (Николаевская, 105) справочное бюро, для записи предложений труда, спроса труда, для справок о Белоруссии, для записи в члены и проч. Для облегчения снабжения продуктами своих членов, правление гуртка в ближайшем будущем открывает потребительский кооператив белоруссов. Справочное бюро открыто ежедневно от 5 до 6 ч. веч. В помещении гуртка, для обсуждения вопросов связанных с организацией белоруссов, состоится общее собрание 2 февраля в 11 ч. утра» [14, с. 3]. У гэтым жа нумары быў апублікаваны і парадак дня сходу: «1) Утверждение устава; 2) довыборы членов правления; 3) отношение громады к русскому национальному съезду и совету; 4) текущие дела» [14, с. 1].

Больш за тое, акрамя гуртка ў Тыфлісе існавала працоўнае гандлёва-прамысловае таварыства «Белая Русь», якое цесна ўзаемадзейнічала з Беларускай Радай. З газетнай аб'явы таксама вядома, што таварыства мела сваё праўленне і статут [17; 18; 19]. На жаль, іншых звестак аб «Белай Русі» у газетах пакуль што не знойдзена.

Больш падрабязна даведацца пра тое, што сабой уяўлялі гэтыя арганізацыі, можна на падставе архіўных дакументаў. Так, у пачатку снежня 2016 г. падчас працы ў Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве Грузіі (ЦДГАГ) аўтарам былі знойдзены два фонды: «Каўказская Краёвая Беларуская Рада» (№ 2091) і «Тыфліскі гурток Беларускай грамады» (№ 2092). У вопісах дадзеных фондаў адсутнічае гістарычная даведка, вядома толькі тое, што ў 1955 г. гэтыя справы (па шэсць спраў у кожным з фондаў) былі перададзены ў ЦДГАГ з Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва Украінскай ССР, дзе захоўваліся пад грыфам «Сакрэтна». Храналагічна дакументы гэтых фондаў ахопліваюць перыяд з 1917 па 1918 гг. і датычацца перапіскі з іншымі нацыянальнымі арганізацыямі (Закаўказскі Рускі нацыянальны савет, Украінская Краёвая Рада Закаўказзя, Адэская арганізацыя «Беларусі гай»), ўрадавымі і прыватнымі ўстановамі Грузіі па розных пытаннях (аб адкрыцці беларускіх школ і прадпрыемстваў, аб нясенні вайсковага абавязку, аб справах бежанцаў, размешчанных на тэрыторыі Закаўказзя, і нават аб стварэнні пры Украінскім корпусе беларускай вайсковай часткі з прызначэннем свайго камісара). Фонды змяшчаюць таксама пратаколы паседжанняў арганізацый, заявы аб прыняцці ў члены Каўказскай Краёвай Беларускай Рады, спісы асоб, якія з іх дапамогай вырашылі вяртацца на Радзіму, прыходна-расходную кнігу ККБР на 1917/1918 гг., вопіс маёмасці Тыфліскага гуртка Беларускай грамады і г. д. Дакументы таксама дазваляюць часткова высветліць кіруючы склад гэтых арганізацый, а таксама сцісла акрэсліць сітуацыю, у якой апынулася беларускае насельніцтва на Каўказе ў вельмі няпросты час.

У дачыненні да пытання аб часе стварэння ККБР, трэба адзначыць, што яно застаецца адкрытым, паколькі ў прыходна-расходнай кнізе Рады адлік часу яе існавання вядзецца з 6 снежня 1917 г., калі паступілі сяброўскія складкі, а ўжо 12 снежня таго ж года прадстаўнікі ККБР накіравалі тэлеграму ў Мінск у «Цэнтральную Беларускую Раду» (хутчэй за ўсё, маецца на ўвазе Вялікая беларуская рада — *аўт.*) [40, арк. 1]. Можна меркаваць, што перыяд з лістапада 1917 г. па красавік 1918 г. з'яўляўся этапам арганізацыйнага станаўлення не толькі ККБР, але і Тыфліскага гуртка Беларускай грамады, пайшчыкаў працоўнага гандлёва-прамысловага таварыства «Белая Русь». Вядома, што першае пасяджэнне праўлення Тыфліскага гуртка адбылося 10 студзеня 1918 г. [41, арк. 1]. Усе арганізацыі цесна кантактавалі паміж сабой і размяшчаліся ў адным будынку Ладзінскага гарадскога прыватнага пачатковага вучылішча. Нявысветленай застаецца таксама дата спынення дзейнасці Рады, гуртка і таварыства. Так, апошні запіс у прыходна-расходнай кнізе ККБР прастаўлены 25 снежня 1918 г. і датычыцца ён выдачы сям'і памёрлага сябры Грамады І. Я. Шыманоўскага грашовай дапамогі ў памеры 91 руб. 71 кап. [40, арк. 15]. Не выключана, што гэтыя арганізацыі маглі праіснаваць і ў наступным 1919 г., аднак дакументаў, якія пацвярджаюць гэта пакуль не выяўлена.

Няшмат вядома і пра кіраўніцтва тыфліскіх арганізацый. Часткова інфармацыя аб іх імёнах і імёнах па бацьку, а таксама пасадах і родзе заняткаў да 1918 г. аднаўляюцца на аснове штогадовых даведачных «Каўказскіх календароў». Дзякуючы аб'яве ў газеце «Каўказскае слова» ад 23 чэрвеня 1918 г. атрымалася вызначыць ініцыялы Старшыні ККБР Веразубова — І. І. З яго ліста на імя міністра замежных спраў Грузінскай Дэмакратычнай Рэспублікі вынікае, што «да здачы Батумі» (хутчэй за ўсё гэта сакавік 1918 г., калі быў падпісаны Брэсцкі мірны дагавор, згодна з якім да Турцыі адышла Батумская вобласць — *аўт.*) ён добраахвотна займаў месца вайсковага інжынера па Міхайлаўскай крэпасці [36, арк. 9]. Яго намеснікамі (таварышамі) былі Канстанцін Восіпавіч Мадзалеўскі, які да 1917 г. з'яўляўся надворным саветнікам Пракуратарскага нагляду тыфліскага акруговага суда [12, слупок 656] і Іван Антонавіч Белагаловы. Да 1915 г. ён выкладаў гісторыю і геаграфію ў Эрыванскай жаночай навучальнай установе святой Рыпсініі, а затым перайшоў на працу ў тыфліскую імператара Аляксандра Благаславёнага мужчынскую гімназію на пасаду настаўніка [12, слупок 330]. На пасадзе намесніка Старшыні Рады ён знаходзіўся да 31 мая 1918 г. [38, арк. 5]. Сакратарамі Рады былі абраны начальнік (на 1915 г.) Шахтахцінскага паштова-тэлеграфнага аддзялення Эрыванскай губерні Канстанцін Навумавіч Савельяў [11, слупок 81] і І. І. (Янка) Натусевіч, які праз некаторы час будзе працаваць сакратаром місіі БНР у Варшаве (1920 г.) [42, с. 180]. Савельяў знаходзіўся на гэтай пасадзе да 29 кастрычніка 1918 г., калі напісаў заяву з просьбай «сложения полномочий» па прычыне яго ад'езда ў Добраахвотніцкую армію [38, арк. 26]. Казначэем Рады быў Ігнат Іванавіч Аўрамчык — да 1917 г. працаваў на пасадзе справавода Канцылярыі папячыцеля Каўказскай навучальнай акругі. Згодна з «Каўказскім каляндаром» ён таксама з'яўляўся старшынёй Тыфліскага Русскага клуба [12, слупок 313, 799]. Для агульнай характарыстыкі ККБР цікавым таксама будзе тое, што справаводства арганізацыі вялося на рускай мове. Рада мела ўласныя штэмпель і пячатку.

На першым паседжанні Тыфліскага гуртка Беларускай грамады старшынёй быў абраны Вершук ці Верашук (у тэксце пратакола неразборліва — *аўт.*), намеснікам старшыні ўжо ўзгаданы вышэй К. В. Мадзалеўскі, казначэем — І. І. Аўрамчык, сакратарамі: Акаловіч (у дакументах Околович) і Голубеў-Багранародны [41, арк. 1]. Апошні, верагодна, гэта вядомы мастак, графік і паэт Леанід Мікалаевіч Голубеў (1890—1934) [5]. Справаводства арганізацыі таксама вялося на рускай мове, яна мела ўласныя штэмпель і пячатку.

Акрамя стаўлення Закаўказскага камісарыята да утварэння і дзейнасці беларускіх арганізацый, можам дадаць, што Грузінская дэмакратычная рэспубліка таксама пазначыла сваю пазіцыю ў дачыненні да іх ў сваіх асноўных дакументах. Так, згодна з пратаколам першага паседжання Нацыянальнага савета Грузіі ад 26 мая 1918 г. падкрэслівалася: «У межах нашай дзяржавы жывуць нацыянальныя меншасці. Мы заяўляем, што нашы нацыянальныя меншасці будуць гетак жа паўнапраўны, як і нацыянальная большасць нашай дзяржавы, грузінскі народ» [8, с. 334]. Тое ж было адзначана і ў Акце незалежнасці Грузіі ад 26 мая 1918 г. у артыкуле 5 — грамадзянскія і палітычныя правы ўсім грамадзянам; артыкуле 6 — шырокая прастора для свабоднага развіцця усім народнасцям, жывучым на яе тэррыторыі [8, с. 337].

Аднак не заўсёды тое, што дэкларавалася на паперы адпавядала рэальнаму стану спраў.

Што датычыцца непасрэдна грамадска-палітычнай актыўнаці і дзейнасці гэтых арганізацый, то трэба падкрэсліць, што яе галоўныя накірункі былі акрэслены на паседжанні ККБР 9 красавіка 1918 г., калі былі утвораны юрыдычная, працоўная, фінансавая, навукова-мастацкая і эвакуцыйная секцыі [37, арк. 5—6]. Праца юрыдычнай секцыі была накіравана на аказанне кваліфікаванай прававой дапамогі беларусам на Каўказе, працоўная секцыя прыкладвала намаганні для пошуку і працаўладкавання ўраджэнцаў Беларусі ў Грузіі. Мэта навукова-мастацкай секцыі была распісана ў чарнавіку закліка «Призыв к беларусам», падрыхтаванага да друку ў адным з нумароў газеты «Кавказское слово»: «У белоруссов есть свое народное искусство, полное красоты, есть своя история полная поучительности. Секция с любовью будет собирать в общую сокровищницу человеческую каждую искру души народной. Белоруссам нужна грамота, нужно знание, чтобы занимать почетное место в человеческой семье. В этом роде будет заботиться эта секция» [37, арк. 3]. У якасці прыклада дзейнасці секцыі, можна ўзгадаць наступнае: 10 лістапада 1918 г. у зале музычнай кансерваторыі Каўказская Краёвая Беларуская Рада арганізавала для беларускіх жыхароў Тыфліса лекцыю на тэму «Беларускае пытанне», якую прачытаў вядомы расійскі гісторык-славіст і этнограф Ф. Ф. Арыстаў (1888—1932). На той час (з 1918 па 1920 гг.) ён выкладаў у Тыфліскім дзяржаўным універсітэце [20, с. 1]. За прачытаную лекцыю, аб змесце якой да сённяшняга часу невядома, яму было выплачана 50 рублёў [40, арк. 14].

Як паказваюць дакументы, адным з галоўных кірункаў дзейнасці ККБР была арганізацыя эвакуацыі беларускага насельніцтва з Каўказа ў напрамку Беларусі па маршруце: Тыфліс–Батумі–Поці, потым марскім шляхам да Адэсы, а адтуль сухапутным транспатам на поўнач. Супрацоўнікамі секцыі былі падрыхтаваны адпаведныя спісы, пажадаўшых вярнуцца на Радзіму [39]. З дакладу членаў ККБР У. А. Зелянькова і М. Е. Барысаўа аб колькасці і становішчы беларусаў на Каўказе вынікала, што па прыватных звестках у рэгіёне ў 1918 г. знаходзілася звыш 80 тысяч беларусаў, «частка якіх займала да гэтага часу дзяржаўныя і прыватныя пасады, частка ўсталявалася на сталае жыццё пасля заканчэння ваеннай службы ў обосновалась на жительство после окончания военной службы ў мірны час, а большую частку складаюць перасяленцы, якія перасяліліся на Каўказ у перыяд часу 1906—1914 гг. і надзелены зямельнымі ўчасткамі» [38, арк. 27]. Нават калі прыняць гэту лічбу за сапраўдную, што малаверагодна, то да яе неабходна яшчэ дадаць і колькасць бежанцаў Першай сусветнай вайны з тэррыторыі Беларусі. Што датычыцца гэтай лічбы, то дакладных звестак аб колькасці і геаграфіі беларускіх бежанцаў на Каўказе ў няма.

Паводле дадзеных Камітэта яе Імператарскай вялікасці вялікай княгіні Таццяны Мікалаеўны (Таццянінскага камітэта) у канцы 1915 г. на Каўказе знаходзілася ўсяго 180621 чалавек [22, слупок 177], аднак невядома які працэнт ад гэтай лічбы складала беларускае насельніцтва. Так, толькі з тэрыторыі Гродзенскай губерні колькасць беларускіх бежанцаў (у тэксце дакумента яны фігуруюць пад назвай «рускае насельніцтва» — *аўт.*) складала 6330 чалавек (Кубанская вобласць — 1866 мужчын і 2358 жанчын; Стаўрапольская губернія — 707 мужчын і 827 жанчын; Церская вобласць — 272 мужчын і 300 жанчын)

[34, арк. 2 адв. —3]. Няпоўныя дадзеныя ёсць і за больш позні перыяд. Так, на 1 лютага 1917 г. у Кубанскай вобласці знаходзілася 7232 беларускіх бежанца [24, с. 234]. Прыблізна гэтую лічбу (8784 чалавек), але ахопліваючы ўсю тэрыторыю Паўночнага Каўказа і Закаўказзя на пачатак 1917 г., выкарыстоўваюць расійскія даследчыкі М. А. Міхалёў і С. А. П'янкоў [28, с. 101]. Гэтую лічбу можна параўнаць з колькасцю беларускіх бежанцаў з прылеглай да Кубанскай вобласці і Стаўрапольскага края Вобласці Войска Данскога, дзе на 10 кастрычніка 1918 г. значылася 19889 чалавек з Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай і Мінскай губерні. У памежных адміністрацыйных адзінках сітуацыя выглядала наступным чынам: Чаркаская акруга — 70 чалавек з Віленскай, 1080 — з Гродзенскай, 12 — Мінскай губерняў; 1-ая Данская акруга — 35 чалавек з Віленскай, 3507 — Гродзенскай, 201 — Мінскай губерняў; Сальская округа — 7 чалавек з Віленскай, 220 — Гродзенскай, 12 Мінскай губерняў [7, арк. 9].

Дакладна не вядома колькі людзей скарысталіся дапамогай Беларускай Рады і выехалі дадому, але кіраўніцтва і члены гэтай арганізацыі прыкладвалі ўсе намаганні па вырашэнні гэтай складанай задачы.

У якасці прамежкавых высноў (паколькі дадзенная тэма працягвае распрацоўвацца) можна пазначыць наступнае: па-першае гэта тое, што ў апублікаваных і архіўных крыніцах захаваліся звесткі аб разнапланавай дзейнасці на Каўказе арганізацый, створанных на аснове этнічнай і/ці тэрытарыяльнай прыналежнасці. Сярод фактараў, паўплываўшых на гэты працэс, можна назваць сацыяльныя трансфармацыі, якія адбываліся на тэрыторыі ўсёй Расійскай імперыі і не маглі не закрануць беларускі этнас, а таксама з'яўленне іерархічных структур на Каўказе па этнічнай прыкмеце (узнікненне дзяржаўных утварэнняў у паўночнай і паўднёвай частках рэгіёну). Гэта стымулявала беларускае насельніцтва ў інаэтнічным асяроддзі да аб'яднання, адстойвання інтарэсаў і сумесных дзеянняў па абароне сваёй этнічнай групы ў склаўшыхся абставінах. Па-другое, грамадска-палітычная актыўнасць беларускага насельніцтва на Каўказе была скіравана не толькі на разнастайную дапамогу прадстаўнікам свайго этнаса, але і рабіла намаганні па стварэнні умоў арганічнай інтэграцыі беларускага насельніцтва ў сацыяльна-эканамічныя структуры новых дзяржаўных утварэнняў. Па-трэцяе, трэба падкрэсліць, што кіраўніцтва Беларускай Народнай Рэспублікі разглядала Каўказскі рэгіён як паўнавартасную пляцоўку для міждзяржаўнага ўзаемнага прызнання сваіх утварэнняў у якасці самастойных суб'ектаў і патэнцыйных саюзнікаў на новай палітычнай карце Еўропы. На прыканцы можна толькі дадаць, што вышэй узгаданыя меркаванні патрабуюць больш грунтоўнага фактаграфічнага падмурку і пошуку новых гістарычных крыніц.

### Бібліяграфічны спіс


1. Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі: у 2-х ч. / Уклад., падрыхт. тэксту, уступ. арт., камент., пер., паказ. С. Шупы. — Вільня, Нью-Ёрк, Менск, Прага, 1998. — Т. 1, кн. 1—2.
2. Варонка, Я. Беларускі рух ад 1917 да 1920 году. Кароткі агляд. — Коўна: Т-ва імя Ф. Скарыны, 1920. — 29 с.
3. Васілеўскі, Ю., Сёмуха, А. Літаратурны акалот: Антон Беларусаў-Скалка // Запісы Беларускага інстытута навукі і мастацтва. — Нью-Ёрк: БІНІМ, 1999. — Кн. 23. — С. 149—164.

4. Васілеўскі Ю. Троська Язэп Касьянавіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі (ЭГБ): У 6 т. / Рэдкал.: Г. П. Пашкоў (галоўны рэд.) і інш. — Мінск, 2001. — Т. 6, кн. 1. — С. 521.

5. Голубев-Багрянородный [Электронный ресурс] / Искусство и архитектура русского зарубежья. — 2013. — Режим доступа: http://www.artrz.ru/menu/1804657343/1804783884.html. — Дата доступа: 15.12.2017.

6. Дзеяльнасьць беларускіх арганізацый у Адэсе // Незалежная Беларусь. 1919. — 27 кастрычніка.

7. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. — Ф. Р-1261. — Воп. 2. — Спр. 3.

8. Документы и материалы по внешней плитике Закавказья и Грузии. — Тифлис: Тип. Правительства Грузинской республики, 1919. — 514 с.

9. Езавітаў, К. Угодкі вялікага абуджэньня // Беларуская газэта. — 1943. — 17 чырвеня.

10. Зубко, О. БНР и УНР. Друзья по несчастью. Ч. 2. [Электронный ресурс]. — 2014. — Режим доступа: http://www.istpravda.ru/bel/research/11398/. — Дата доступа: 15.12.2017.

11. Кавказский календарь на 1915 год / Под ред. А. А. Эльзенгера, Н. П. Стельмащука. — Тифлис: Тип. Канц. Наместника Е. И.В. на Кавказе 1914. — 1013 с.

12. Кавказский календарь на 1917 год / Под ред. Н. П. Стельмащука. — Тифлис: Тип. Канц. Наместника Е. И.В. на Кавказе, 1916. — 12321 с.

13. Кавказское слово. — 1918. — 6 января.

14. Кавказское слово. — 1918. — 1 февраля.

15. Кавказское слово. — 1918. — 11 мая.

16. Кавказское слово. — 1918. — 26 мая.

17. Кавказское слово. — 1918. — 23 июня.

18. Кавказское слово. — 1918. — 26 июня.

19. Кавказское слово. — 1918. — 28 июня.

20. Кавказское слово. — 1918. — 9 ноября.

21. Кавказское слово. — 1918. — 28 ноября.

22. Киржниц, А. Д. Беженство // Большая советская энциклопедия: в 65 т. — 1-е изд. М., 1930. — Т. 5. — С. 176—178.

23. Клімовіч, М., Міхнюк, У. Краскоўскі Іван Ігнатавіч // ЭГБ: У 6 т. — Мінск, 1997. — Т. 4. — С. 250.

24. Кобрын, М. У. Бежанцы і Беларускі нацыянальны рух у 1914—1920 гг. // Славянскі свет: мінулае і сучаснае: матэр. рэсп. навук. канф., 26 сакавіка 2004 г.; рэдкал.: А. П. Жытко (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск, 2004. — С. 233—236.

25. Красковська, Л. З давніх часів. — Prešov: EXCO s. r.o, 1999. — 85 s.

26. Краўцоў, М. Ўсебеларускі Зьезд 1917 г. (Рэферат чытаны ў Лодзі для афіцэраў Беларускіх Вайсковых Аддзелаў і служачых Беларускай Вайсковай Камісіі 27 кастрычніка 1920 г.) // Беларускі Звон. — 1921. — 9 верасьня. — С. 3—4.

27. Магілёўшчына: [зборнік] / пад кіраўніцтвам і рэдакцыяй А. М. Беларусава. — Магілёў, 1927. — Т. 1. — 183 с.

28. Михалев, Н. А., Пьянков, С. А. Беженцы Первой мировой войны в Российской империи: численность, размещение, состав // Уральский исторический вестник. — 2015. — № 4 (49). — С. 95—105.

29. Міхалюк, Д. Беларуская Народная Рэспубліка ў 1918—1920 гг.: ля вытокаў беларускай дзяржаўнасці / навук. рэд. С. Рудовіч; пераклад з польскай мовы А. Пілецкі. — Смаленск: Інбелкульт, 2015. — 495 с.

30. Міхнюк, У. М. Валькові Аляксандр Іванавіч // ЭГБ: У 6 т. — Мінск, 1994. — Т. 2. — С. 216.

31. Найдзюк Я. Беларусь учора і сяньня. Папулярны нарыс з гісторыі Беларусі. — 2-е выд. пашыранае. — Менск, 1944. — 304 с.

32. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 205. — Воп. 3. — Спр. 8183.

33. НАРБ. — Ф. 325. — Воп. 1. — Спр. 10.

34. НАРБ. — Ф. 325. — Воп. 1. — Спр. 21.

35. Отчет о деятельности Закавказского Русского национального комитета. — Тифлис: Тип. насл. К. П. Козловского, 1919. — 56 с.

36. Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Грузіі (ЦДГАГ). — Ф. 2091. — Воп. 1. — Спр. 1.

37. ЦДГАГ. — Ф. 2091. — Воп. 1. — Спр. 2.

38. ЦДГАГ. — Ф. 2091. — Воп. 1. — Спр. 3.

39. ЦДГАГ. — Ф. 2091. — Воп. 1. — Спр. 4.

40. ЦДГАГ. — Ф. 2091. — Воп. 1. — Спр. 6.

41. ЦДГАГ. — Ф. 2092. — Воп. 1. — Спр. 3.

42. Чарнякевіч, А. М. Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919—1939 гг. — Гродна: ЮрСаПрінт, 2015. — 306 с.

43. «Белоруссы, Рада зовет вас...»: стварэнне і дзейнасць Каўказскай Краёвай Беларускай Рады / Публ. і камент. А. М. Максімчык // Беларускі археаграфічны штогоднік / Рэдкал.: Э. М. Савіцкі (гал. рэд.) і інш. — Мінск: БелНДІДАС, 2017. — Вып. 18. — С. 230—246.

**Михайловская Людмила Львовна**

*Белорусский государственный университет (Минск, Беларусь)*

## РУССКАЯ РЕВОЛЮЦИЯ 1917 Г. И ВОССТАНОВЛЕНИЕ ПОЛЬСКОГО ГОСУДАРСТВА

«Польский вопрос», возникший после разделов Речи Посполитой, поднимавшийся польскими патриотами и обсуждавшийся европейскими политиками разного уровня, получил реальную возможность разрешения с началом Первой мировой войны. В политике воюющих держав складывались различные варианты дальнейшей судьбы Польши.

«Русский» сценарий решения польского вопроса нашёл отражение в Манифесте (14 августа 1914 г.), изданном Верховным главнокомандующим сухопутными и морскими силами России великим князем Николаем Николаевичем. Он предполагал объединить польские земли с последующим предоставлением Польше автономии в составе Российской империи. Последовательным сторонником великодержавной политики был Р. Дмовский, считавший Россию защитницей Польши от германской агрессии, способной воссоединить польские земли, захваченные Австрией и Пруссией. Сторонники Й. Пилсудского связывали освобождение Польши с помощью Австро-Венгрии в ходе ее войны с Россией, которая стала неизбежной после Боснийского кризиса 1908 г. Готовясь к боевым действиям, они под покровительством Австро-Венгрии создавали военные организации в Галиции, на базе которых в начале первой мировой войны возникли польские легионы.

Данное соотношение сил изменили революции в России. Еще в 1916 г. была написана статья В. И. Ленина «О мире без аннексий и о независимости Польши как лозунгах дня в России», Петроградский Совет в марте 1917 г. принял обращение к «Народу польскому», в котором утверждалось, что «Польша имеет право быть совершенно независимой в государственно-международном